Назаўтра Васіль прыйшоў недзе каля абеда і... расчараваў мяне. Я ажно ўстрывожыўся. Быў ён акуратна падстрыжаны і, можа, таму нейкі прыгладжаны, кажучы па-пісьменніцку, як бы адрэдагаваны. Для мяне, як мастака, гэта ўскладняла справу — знікла нешта з той непаўторнасці ў знешнім абліччы, якую, як мне здавалася, я ў яго падгледзеў. Праца ў мяне не надта клеілася — я ніяк не мог злавіць у ягоным твары, ягоным настроі новае, не заўважанае напярэдадні. Скончылася ўсё тым, што мы вырашылі паабедаць у рэстаране гатэля. Спусціліся ўніз, занялі ўтульны столік, заказалі бутэльку армянскага каньяку і такую-сякую закусь. І тут Быкаў нібы скінуў з сябе халаднаватую "прыгладжанасць" і на лоб зноў вярнуліся непаслухмяныя пасмы русых валасоў...

Я ўжо ведаў, што не заўсёды выдатны пісьменнік бывае і бліскучым расказчыкам. Часцей — наадварот. Але ў тым застоллі я адкрыў унікальнага расказчыка Васіля Быкава. Ён зачараваў нас з жонкаю сваімі поўнымі гумару і дабрыні аповедамі і пра франтавыя прыгоды, і пра пісьменніцкія ўзаемаадносіны, і пра сваіх гродзенскіх сяброў. А яшчэ я даведаўся пра ягоныя сімпатыі да жывапісу. Ён аддаваў іх рэалістычнаму мастацтву, высока цаніў уменне адчуваць прыроду, улоўліваць дыханне зямлі. З горыччу і нават раздражненнем гаварыў, як запаланіла мастацтва бяскрылая, нахабная кан'юнктура, як халуйскае слугаванне ўладзе губіць талент. Пры гэтым спасылаўся і на вопыт літаратуры так званага сацыялістычнага рэалізму. Вельмі шчыра хваліў маладых мастакоў за іхнюю ўвагу да нацыянальнай гісторыі, за пошукі новых выяўленчых сродкаў, за творчую смеласць...

Час бег хутка, развітвацца не хацелася, але на вуліцы ўжо сутоньваўся вечар. Калі мы ўсё ж разышліся, я з усёй шчырасцю і несумненнасцю ўсвядоміў, які глыбокі, таленавіты і непаўторны чалавек і творца Васіль Быкаў.

Зянон ПАЗЬНЯК:

«Ягоны голас і цяпер гучыць мне ў вушах»

...Апошні раз я размаўляў з Быкавым па тэлефоне зь Нью-Ёрка 5-га чэрвеня, перад ягоным ад'ездам у анкалягічны шпіталь. Быў ён вельмі сумны, гаварыў пра сваё расчараваньне замежжам, пра цяжкі стан, безвыходнасьць, што існуе наўкола, пра тое, што яму дрэнна і што ён ад'язджае... у Бараўляны.

Бараўляны — гэта сымвал, які выклікае трывогу. Усе гэта ведаюць. Інтуітыўна я адчуў, што размаўляю апошні раз, і што Быкаў, відаць, гэта таксама ведае.

Я пачаў яго роблена падбадзёрваць і гаварыць банальнасьці. Атрымлівалася фальшыва. Быкаў уздыхаў, хмыкаў і сьціпла цярпеў, пакуль я ня змоўк. Гэтага маўчаньня мне хапіла, каб вярнуцца ў рэальнасьць. І я сказаў яму тое, што думаю і кажу заўсёды: "Што б ні было, Васіль Уладзіміравіч, і што б хто ні рабіў, я ведаю адно — жыве Беларусь і будзе жыць. Ніхто ўжо нас не пераможа, ніякая гэбоўская Расея і ніякая лібэрал-Эўропа. Наша будучыня з намі. Гэта станецца. Верце мне. Яна ўжо йдзе, толькі ніхто ня бачыць".

Голас Быкава пацяплеў, і я зразумеў, што ён заўсьміхаўся і нават узрадаваўся. Ён заўсёды ўсьміхаўся і радаваўся, калі я яму такое казаў, лагодна адмаўляючы мой аптымізм. "Ну, дай жа Бо-ожа, як кажуць, дай жа Бо-ожа", — паўтараў з таго боку прыхільны голас. Ён і цяпер гучыць мне ў вушах.

***

Пра сьмерць Быкава я даведаўся днём, 22 чэрвеня, дзесьці каля 16-й гадзіны (23-й у Менску) у машыне па дарозе зь Нью-Ёрка ў Нью-Джэрзі. Уключылі радыё. Гаварылі пра творчасьць Быкава, называючы яго ў мінулым часе. Мне аж кальнула. Я зразумеў, што Быкава з намі ўжо няма. Мы ехалі моўчкі. Дома ў тэлефоне было запісана паведамленьне Сяргея Навумчыка з Чэхіі аб тым, што памёр Быкаў. Я тут жа патэлефанаваў яму ў Прагу, потым у Менск сябрам у Народны Фронт, выказаў свае прапановы па арганізацыі пахаваньня, папрасіў, каб быў таксама вянок ад мяне, потым пісаў словы разьвітаньня — усё, як на аўтапілёце.

На пахаваньне Васіля Быкава ў Менску прыйшла моц народу, людзі пад Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі ў жалобе, узрушэньні і цішыні, людзі сьветлай Беларусі. Гэта быў сьвет Быкава. Ён хацеў, каб было так, каб апошняя дарога была яго — дарога беларуса пад роднымі сымваламі ў суправаджэньні духоўна родных людзей.

У беларускай царкве ў Гайленд-Парку каля Нью-Ёрка адслужылі паніхіду па Васілю Быкаву. Потым беларусы сабраліся ў залі фундацыі Крэчэўскага ў Квінсе на сход, пасьвечаны памяці вялікага пісьменьніка. Выступоўцы гаварылі пра ягоную творчасьць і ейнае месца ў беларускай і сусьветнай літаратуры, пра беларускую ягоную асобу, пра веліч ягонай душы. У канцы выйшла Галя Навумчыкава, каб расказаць пра апошнія дні Васіля Уладзіміравіча. Пасярэдзіне апавяданьня яна спынілася і пачала ціха плакаць. Астатнія сядзелі ў цішыні.

***

Васіль Быкаў сваёй творчасьцю высока ўзьняў у сьвеце асобу беларуса, ягоны характар, спосаб думаньня, ягоную прысутнасьць у жыцьці на Зямлі. Гэтым ён вялікі пісьменьнік для беларусаў і для ўсяго сьвету.

Але Быкаў значны яшчэ іншым. Ён знакавая (я сказаў бы, сакральная) фігура для ўсёй Беларусі. Яшчэ пры жыцьці Быкава называлі сумленьнем беларускай нацыі, і гэтак яго ўспрымалі.

Васіль Быкаў сапраўды быў сумленьнем нацыі. Ён — ваяр з гітлераўскім фашызмам — не служыў ні камуністам, ні мамоне, а толькі Беларускай літаратуры і Беларусі. Ён ніколі нікому не прадаваў свайго сумленьня. Рабіў так, як думаў.

Васіль Быкаў — адзін зь нямногіх старэйшых пісьменьнікаў і творцаў, які на вырашальным павароце нацыянальнай гісторыі зрабіў рашучы выбар — не вагаючыся і не азіраючыся, стаў на бок беларускага нацыянальнага Адраджэньня, прыняў ідэалы 25 Сакавіка, стаў у шэрагі Беларускага Народнага Фронту і застаўся верным Беларусі да канца.

Вось дзе гістарычная веліч асобы Быкава. Былі таленты ў іншых літаратурах, што пісалі вялікае, а рабілі — нікчэмнае. Быкаў не такі. Гэта глыба, скала, моц таленту, розуму, добрасьць душы і веліч, высакароднасьць асобы.

Як добра, што ў нас, беларусаў, ёсьць такі дух, такі выдатны пісьменьнік. І колькі нам Бог такіх даў у XX стагоддзі, каб мы ня згінулі. Купала, Колас, Быкаў, Багдановіч, Гарун, Геніюш, Арсеньнева. Шануйма ж, ня страцьма.

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ:

«Бог зрабіў так, як прасіў Быкаў»

...Анколаг Генадзь Мікалаевіч Мураўёў пазваніў мне з работы 22 чэрвеня ўвечары. Недзе пасля шасці. Сказаў, што ў яго праблема, якую ён не ведае, як вырашыць. І хацеў бы са мной сустрэцца, каб параіцца.

Ён прыехаў з Бараўлянаў, сустрэліся і пайшлі па горадзе...

Быкаву засталося жыць, можа, да заўтра. Ён гэта адчуў і папрасіў Мураўёва, каб яго завезлі дахаты. Бо хоча памерці ў сваім ложку.

Ува мне ўсё сцялася: "Дык завязіце, Генадзь Мікалаевіч. Я завёз бы, магу зрабіць гэта з вамі".

Мураўёў сказаў, што Быкаў, адключаны ад сістэмы штучнай падтрымкі жыцця, можа памерці і хутчэй за ўсё памрэ ў машыне.

Тут была праблема... Для доктара яшчэ якая... Я спытаў: "А што Ірына Міхайлаўна?.." Мураўёў адказаў, што нічога. Ці Васіль Уладзіміравіч з ёй пра гэта не гаварыў, ці яна баіцца і таксама не ведае, якое прыняць рашэнне. Яна ж яшчэ спадзяецца...

Я сказаў Мураўёву, што, канешне, узяць такое на сябе ён не можа. А сам вырашыў паехаць і пагаварыць з Ірынай Міхайлаўнай.

Не паспеў... Па дарозе, забегшы дамоў пераапрануцца, зазірнуў да Ніла Гілевіча. Проста словам перакінуцца, бо раптам стала ўсіх шкада, а ён гаротна адзіноціўся: ягоная жонка памірала ад той жа хваробы, што і Быкаў. Перагаварылі, я выйшаў — і ў пад'ездзе сустрэў суседку, якая сказала, што мяне шукаюць, толькі што дамоў званілі: Васіль Уладзіміравіч памёр.

Было каля дзевяці вечара... Суседкай, якая паведаміла мне пра смерць Васіля Быкава, была пляменніца Уладзіміра Караткевіча. Можа, і няма ў тым нічога, але нешта ёсць... Асабліва, калі прачытаць ва ўспамінах Быкава, як не даваў яму Караткевіч сумаваць, суцяшаў ва ўсіх жыццёвых клопатах і казаў, што абодва яны ў кнігах сваіх будуць жыць у народзе. Дадаючы, праўда, што сам народ, калі таго не захоча, можа і не жыць.

Разумеючы, што з пахаваннем Быкава будзе ўсё далёка не проста, я пастанавіў сабе ані ў што не ўлазіць. Каб захаваць той унутраны спакой і, для мяне самога дзіўную і нязвыклую, гармонію, якую стварыла ўва мне нядаўна напісаная паэма. Гэта быў якасны новы стан, які баяўся я разбурыць, не ўсвядоміўшы, што ён такое.

У тым стане і смерць Быкава ўспрыняў я даволі спакойна. Чалавек пражыў — дай Бог кожнаму, а таго, што было ў ягоным жыцці — дай Бог на дзесяцёх. Я прыехаў развітацца, кінуць прыгаршчу зямлі ў магілу і паехаць. Развітаўся, засталося кінуць прыгаршчу зямлі...

Назаўтра раніцай напісаў некалькі радкоў для газеты "Народная Воля", нешта накшталт некралога.

"Дзіўную даў нам Бог краіну. Усё ў ёй нібыта ёсць — у водах рыбы, у лясах звяры і птушкі, у гарадах і вёсках жыхары, якія самі сябе беларусамі называюць, а ладу беларускага, з якога само па сабе было б зразумела, нашто ўсё тут і дзеля чаго, няма і няма. І спрадвеку ў тым нехта вінаваты — то рускія, то палякі, то жыды... Толькі не мы самі, о, не! Дзесяць мільёнаў не вінаватых у тым, што жывуць у айчыне без Айчыны, на таямнічай зямлі з цьмянай, нібыта чужой, гісторыяй і замглёнай, нібыта не сваёй, будучыняй.

Але былі і ёсць людзі, якія жылі і паміралі, адчуваючы сябе ў тым вінаватымі. За сябе і за ўсіх. Бо жылі, каб жыла Айчына, былі, каб была будучыня. Якая, як вядома, пачынаецца з мінулага — але не з цьмянага і з не замглёнага. І не з чужога, а са свайго.

Менавіта па такіх людзях, па іх абрысах паціху-паціху распазнае сама ў сабе Беларусь. І, распазнаная ў сабе, распазнаецца ў свеце. Яна дадаецца імі да свету — і свет, не такі ўжо вялікі і ні на што, апроч людзей, не багаты, дадаецца імі: такімі людзьмі.

Да таго, што зрабіў для Беларусі, для гонару яе і славы Васіль Быкаў, нельга нічога дадаць, апроч бессмяроцця".

З Саюза пісьменнікаў пазваніў Алесь Пашкевіч, папрасіў прыйсці. Яны там сабраліся: з пахаваннем праблемы. Некага бачыць і гаварыць з некім менш за ўсё мне хацелася, але, калі Пашкевіч абіраўся ў старшыні, я трохі ў тым спрыяў яму і абяцаў, у чым змагу, дапамагаць.

Там шмат было народу і яшчэ болей шуму... Нехта прынёс чутку, нібы ўлада хаваць Быкава адмовілася. Крычалі, што і добра, самі пахаваем. Але за што?.. У пісьменнікаў грошай няма, прадстаўнікі апазіцыйных партый таксама развялі рукамі.

Гэткі звыклы гвалт без аніякага выніку... А да ўсяго Уладзімір Арлоў абвясціў, што мае інфармацыю з цалкам дасведчанай крыніцы: улада збіраецца пахаваць Быкава ў самым канцы Маскоўскіх могілкаў, недзе ў балоце...

Я пазваніў Мікалаю Чаргінцу, мяркуючы, што ён, як адзіны пісьменнік ва ўладзе, павінен мець ад яе адпаведныя, звязаныя з пахаваннем, даручэнні. Ён іх і меў, з'явіўшыся гэтак хутка, нібы чакаў званка недзе паблізу ад Дома літаратара. Стаў усіх супакойваць: наконт пахавання распарадзіўся Лукашэнка, чаго ніхто не можа адмяніць. Тады я прапанаваў з'ездзіць на могілкі, каб ён паказаў месца, дзе будзе пахаваны Быкаў.

Паехалі ўтрох: Чаргінец, я і Рыгор Барадулін. Месца было там, дзе належала яму быць — непадалёк ад усіх пісьменніцкіх магіл. Нешта на тым месцы ўва мне, як іголка, кальнулася, пранізала: я стаў на калені і пацалаваў зямлю, у якую пакладзецца Васіль Быкаў. Падняўся ўпэўнены, што ўсё будзе добра: Быкава пахавае Бог.

У Дом літаратара вярнуліся зноўку ў крык... Я ўжо набраў паветра ў грудзі, збіраючыся, каб сціхлі ўсе, таксама закрычаць, і тут адбылося тое, чаго дасюль я не разумею, і ў што мне, каб таго не бачылі яшчэ дзясяткі два чалавек, цяжка было б паверыць: адзін з трох партрэтаў Быкава, з якіх выбіралі надмагільны, якія стаялі на паліцы ўздоўж сцяны, да якіх не падыходзіў ніхто, не кранаў, — дык вось адзін з іх, зашклёны, сам пахіліўся, нібы прыпадняўшыся, і плазмам ляснуўся аб падлогу.

Усе знямелі...

Быкаў прасіў мяне ў шпіталі ўсё зрабіць, што здолею, каб найцішэй было. Рыгор Барадулін казаў, што пра тое самае і яго прасіў. Калі мы пра гэта забыліся — напомніў.

З таго моманту я стаў адчуваць пахаванне Быкава, як нешта містычнае. Успрыняўшы тое, што сталася з партрэтам, яшчэ і як знак для мяне асабіста, бо ў шпіталі распавядаў Васілю Уладзіміравічу пра падобны, амаль гэткі ж выпадак. Толькі не з партрэтам, з абразом...

Мне стала неяк велічна страшна — і далей ужо ані ў што я не лез. Нават не паехаў у дзень пахавання забіраць нябожчыка з Бараўлянаў. Бо з гэтым таксама не маглі канчаткова дамовіцца, спачатку збіраючыся дамоў яго на адпяванне везці, а пасля перадумаўшы: дзявяты паверх — надта высока.

Але Бог вышэй за дзявяты паверх — і Ён не перадумаў, зрабіўшы ўрэшце так, як прасіў Быкаў. Пасля адпявання ў Доме літаратара, калі стала відавочна, што пахаванне Васіля Быкава будзе не ўладна-дзяржаўным пад чырвона-зялёным сцягам, а народна-нацыянальным пад сцягам бел-чырвона-белым, паступіў загад, каб нікога з прадстаўнікоў улады на паніхідзе не было. І пабеглі ўсе, хто з пагонамі, хто без... Схлынула з пахавання ўся нячыстая сіла — і плыла над апошнім зямным шляхам Васіля Уладзіміравіча светлая, з аблокамі і птушкамі, цішыня.

Калі на паніхідзе ўключылі запіс з голасам Быкава, тая іголка, якая кальнулася над будучай магілай Васіля Уладзіміравіча, раптам напалам разламалася, упілася ўсімі чатырма канцамі. Гэта ўжо былі не стрэмкі, нешта іншае, бо забалела зусім інакш, і я раптам так сябе адчуў, як згубіў крэўна блізкага чалавека — і ўжо амаль нічога не чуў і не бачыў нікога, пакуль не падштурхнуў нехта: трэба несці труну...

ТРАГЕДИЯ

Проклятая дедовщина

Как армия может покалечить и сломать жизнь

Об этой истории не рассказывали по телевизору и не сообщали на первых страницах официальных изданий. Те, кто твердит, что в белорусской армии дедовщины как явления не существует в принципе, вообще предпочли бы, чтобы об этом случае узнало как можно меньше людей. История шокирует и жестокостью, и последствиями, и равнодушием…

Мать проводила сына в армию. Парень делал успехи — с отличием окончил учебный центр. Командиры прочили ему военную карьеру, рекомендовали поступать в Военную академию. Он вот-вот должен был вступить в должность замкомандира взвода, однако... В воинской части ***28212,*** *которая находится в столичном микрорайоне “Уручье”, он был избит до такой степени, что, когда поступил в госпиталь с обширным внутренним кровотечением, доктора опасались делать какие-либо прогнозы. Он потерял почти литр крови.*

Александр месяц провел в госпитале, около недели — в реанимации. В части он не хотел распространяться о том, что произошло. Думал: поболит немного живот, синяки пройдут — и все забудется. А когда очнулся после операции и узнал, что врачи удалили селезенку, а другие органы серьезно повреждены, сказал: “Не прощу!”



— Это все случилось 3 мая, — *рассказывает Наталья Габрукович, мать Александра.* — Но мне дочки сообщили только через два дня. Боялись, что не переживу — у меня сердце больное... Я приехала к ним в гости на Пасху, а они говорят: “Мама, присядь... Саша в реанимации...” У меня перед глазами сразу все и поплыло...

На следующий день я отпросилась с работы, напилась лекарств и поехала в госпиталь.

Его еле спасли. Врачи буквально вытащили сына с того света, спасибо им за это большое!

Травма была очень тяжелая. Это как надо было бить, чтобы раздробить и селезенку, и поджелудочную!.. Вся брюшная полость была в крови. Его сразу на операционный стол, пять дней в реанимации... И дела пока нехорошие, еще предстоит долгая и трудная реабилитация...

По словам Натальи Александровны, ее сын хотел служить. И в армию пошел уже 26-летним.

— Ему все отсрочки давали, каждые полгода в военкомат вызывали, в последний раз он сказал: “Или призывайте, или больше не дергайте!”, — *говорит мама Александра.* — Он с такой охотой пошел на службу, столько планов было! И все насмарку, эта проклятая дедовщина поломала парню жизнь...

ПРЯМАЯ РЕЧЬ

Александр ГАБРУКОВИЧ:

«Как жить?..»

Александр Габрукович сейчас изо всех сил старается выжить. И вернуться к нормальной жизни — настолько, насколько это возможно в его ситуации.

По просьбе “Народной Воли” Александр рассказал о том дне, который разделил его жизнь на “до” и “после”...

— Понимаю, что вам неприятно вспоминать, но расскажите, пожалуйста, кто вас избил?

— Парень, который на полгода раньше меня призвался в армию. Он прослужил год, а я — полгода.

— Из-за чего случился конфликт?

— Конфликта не было. Виталий С. возмутился, узнав, что я сходил в солдатскую чайную без его разрешения. Хотя я, сержант, не должен был перед ним отчитываться — он мне не начальник, просто рядовой.

В тот день я был в наряде по столовой. Он, находясь от меня метрах в десяти, спросил, был ли я в чайной. Я ответил, что да. И через несколько секунд получил сильный удар в бок. Это было настолько неожиданно, что я не успел среагировать. К тому же мы с парнем вдвоем несли большой чан с котлетами. От боли я согнулся, а он стал избивать меня дальше.

— В столовой был кто-то из старших офицеров, которые могли остановить драку?

— Не знаю. Если честно, там было много людей, и кто-то должен был видеть. Но все сидели и смотрели. Нас разнял парень, который вместе со мной дежурил по столовой. Напоследок мне еще пригрозили вечерними разборками...

— Что было потом?

— Я продолжил нести службу в наряде. Шесть часов ходил с кровотечением в животе. Боли были дикие. Сразу мне было тяжело дышать, не мог разогнуться, корчился, но надеялся, что все пройдет. Однако с каждым часом становилось все хуже и хуже. В конце концов не выдержал и обратился в санчасть. Фельдшер сразу понял, что дело серьезное. Когда я лег на кушетку, меня всего колотило... Привезли в госпиталь, сделали рентген и сказали, что внутри — серьезное кровотечение, раздроблена селезенка, отбит хвост поджелудочной железы и большая гематома толстой кишки. Сразу положили на операционный стол. Пять дней я провел в реанимации. Когда пришел в себя, обо всем рассказал матери, она сразу пошла в комендатуру и написала заявление...

— Парень, который вас покалечил, на свободе?

— Да. Служит в той же части.

— Он знает о состоянии вашего здоровья?

— Думаю, да. Звонил мне, когда я еще в госпитале лежал. Пытался сказать, будто осознал, что сделал. Я ему ничего не сказал. Что говорить, если этот человек сломал мне жизнь?

— Может, знаете, кого уже наказали за эту историю?

— Возбудили уголовное дело. Скоро должен быть суд. Вроде бы в части к дисциплинарной ответственности привлекли кого-то из тех, кто дежурил в тот день по части и по столовой. Но какое конкретно наказание они понесли — точно не знаю, мне об этом никто не говорил. Если честно, хотелось бы вообще все забыть. Но вряд ли получится...

— Руководство части пыталось оказать вам какую-то помощь?

— Там есть один майор, который помог, чтобы меня быстрее отправили в отпуск, а не держали после госпиталя в санчасти. Мне нужны были особые условия, специальное питание. Но только этот человек и проявил внимание. Всем остальным, как мне показалось, было безразлично.

— А ваш непосредственный командир? Как, кстати, его зовут?

— Мой главный командир — командир дивизиона подполковник Михолап. Когда меня перевели из реанимации, позвонил и спросил, что случилось. И больше я никого не видел и не слышал.

Я после всего этого очень сильно похудел — за месяц на 16 килограммов...

— Что врачи говорят?

— Обращают внимание, что для восстановления после такой операции очень важны первые два года. Предупреждают, что иммунитет может пострадать, потому что селезенки нет. Нужно соблюдать строжайшую диету, избегать нагрузок, мне нельзя бегать, плавать, переохлаждаться, поднимать больше пяти килограммов. Работать тоже сейчас нельзя...

Нужно, чтобы организм научился работать по-новому, чтобы функции селезенки взяла на себя печень. Еще необходимо каждый месяц сдавать анализы, правда, где их делать, я пока не знаю — то ли в обычной поликлинике, то ли в госпитале. Выписку на руки мне дали, но там об этом ничего не написано. Может быть, когда придут документы из военно-врачебной комиссии, будет какая-то ясность. Пока никто ничего толком не объяснил...

— Вас после госпиталя выписали домой?

— Нет, направили обратно в часть. Я лежал в медсанчасти. В госпитале рекомендовали строгую диету, а в санчасти никому отдельно не готовят — всем дают одну и ту же еду, так положено. Я поел немного, а потом ночь не спал, боли были адские! Слава Богу, что в отпуск отправили...

Врачи сделали все возможное, чтобы меня спасти. В госпитале еще отношение нормальное было, а вот в армии... Я туда вернулся — ни помощи, ни внимания, даже не поговорил никто! Надеюсь, что меня комиссуют, и в медсанчасть возвращаться уже не придется. Потому что выходить оттуда нельзя, еду приносить свою тоже запрещено...

— Я так понимаю, что инвалидность вам не дали?

— А я и сам не знаю. Пока еще документы не дошли из военно-врачебной комиссии. У меня была повреждена ведь не одна селезенка, а еще поджелудочная железа и толстая кишка. Но дадут группу или нет — мне не известно.

— Как вы сейчас себя чувствуете?

— После операции уже и времени немало прошло, но иногда такие боли бывают, что кричать хочется. Недавно приступ случился, связались с доктором, он сказал, что боль будет мучить еще целый год, чтобы по две таблетки но-шпы в таких случаях пил. Только вот будет ли она помогать?.. Я пару дней вообще с постели не вставал, потом лучше стало, отпустило помаленьку...

В интернете почитал, что в такой ситуации, как моя, нужно восстановление интенсивное, санатории и все такое. Только вот где деньги на все это взять? Мне сейчас целый год работать нельзя, а у меня жена, и ребенку нет еще двух лет...

Как жить?..



Александр Габрукович крайний справа в нижнем ряду.

ОФИЦИАЛЬНО

Как отреагировали на историю Александра Габруковича в Министерстве обороны? Кого и как наказали за этот вопиющий случай? Почему за месяц никто из армейского руководства не связался ни с Александром, ни с его матерью и не поинтересовался, какая помощь им нужна?

За ответами на эти и другие вопросы “Народная Воля” обратилась в Министерство обороны.

Начальник управления информации Главного управления идеологической работы Минобороны **Владимир Макаров** подготовил для “Народной Воли” письменный ответ из двух частей: *“По поводу неуставных взаимоотношений”* и “*О состоянии правопорядка в белорусской армии в целом”.* Однако конкретных фамилий в нем, к сожалению, нет. Больше рассуждений и ссылок на то, что, мол, в некоторых зарубежных странах ситуация в армии еще хуже, там, дескать, процветает сексуальное насилие, а у нас его нет... Поэтому ответ полковника Макарова приводится с небольшим сокращением: “*Я сомневаюсь, чтобы “Народная Воля” попыталась объективно разобраться в сути неуставных взаимоотношений в в/ч 28212. Тем более что случай этот явно нетипичный, хотя и привел к тяжелым последствиям. Дело в том, что оба военнослужащих, вступивших в конфликт, характеризовались вполне положительно. Вместе с тем тот факт, что элементарные вопросы взаимодействия двух нормальных людей вместо нормальных человеческих отношений оказались трансформированы в хамство, грубость и попытку разрешения элементарной проблемы (конфликт из-за котлеты в столовой?!) только физической силой, — говорит о многом.*

Других людей нет. Именно с этими людьми необходимо работать, воспитывать их, ликвидируя в армии последствия педагогической запущенности.

По факту неуставных взаимоотношений в в/ч 28212 командиром части возбуждено уголовное дело. В настоящее время проводятся следственные действия, и мы не вправе комментировать их ход. Но общественность должна знать, что в соответствии со статьей 443 Уголовного кодекса за подобные деяния предусмотрено наказание — лишение свободы на срок от 3 до 12 лет.

Еще раз подчеркну, что это нетипичный случай. Пострадавший — человек, которого в принципе никто не должен был бы обидеть, он не только старше своего обидчика на несколько лет, но и в отличной спортивной форме, судя по его характеристикам, занимался восточными единоборствами...

Но факт есть факт. Виновнику придется отвечать по закону.

Что же касается должностных лиц, в той или иной мере виновных в произошедшем (бесконтрольность, незнание обстановки и т.д.), то все они уже привлечены к строгой дисциплинарной ответственности, так как в их компетенции предотвратить тяжкие последствия любых проступков.

При этом наша позиция такова — всемерно должен поддерживаться и поощряться тот командир и начальник, который выявляет правонарушения до наступления тяжких последствий (тех же травм) вне зависимости от количества возбужденных уголовных дел, так как главное — это жизнь и здоровье людей. Но если факт неуставных взаимоотношений выявляет врач на операционном столе — то никакой пощады не будет ни самому правонарушителю, ни соответствующим начальникам, которые не способны обеспечить правопорядок.

(...)В прошлом году в белорусской армии возбуждено 20 уголовных дел по фактам неуставных взаимоотношений. В 2003 году — их было 99 (при этом численность военнослужащих срочной военной службы за этот период почти не изменилась).

Правда, были иные времена. До 1994 года месяца не проходило, чтобы в СМИ не появлялись статьи типа “Казарменное мясо”, “Синдром цвета хаки”... Более 100 человек погибших на сто тысяч военнослужащих, в том числе более 40 самоубийств. Все это было...

Сегодня подобные явления единичны. Но если бы не меры, принятые в стране и армии по наведению правопорядка после 1994 года, то минимум 2 тысячи молодых парней отправились бы домой грузом “200”...

Еще раз подчеркну, позиция Минобороны была и остается неизменной — с неуклонной твердостью будут пресекаться любые правонарушения в армии, прежде всего связанные с неуставными взаимоотношениями. Созданная система поддержания правопорядка однозначно обеспечит неотвратимость наказания непосредственных виновников правонарушений, а значит, рано или поздно любые преступные деяния, будь то неуставные взаимоотношения или иные преступления, будут раскрыты, а виновные привлечены к ответственности”.

P.S.

Трудно комментировать слова представителя Минобороны. Наверное, если бы на месте Александра Габруковича, не дай Бог, оказался бы его сын, акценты в речи полковника были бы совсем другими...

И простые слова поддержки армейские начальники семье парня могли бы высказать. И не ждать, пока их попросят о помощи, в том числе и материальной...

Кто-нибудь из них подумал, как парню жить дальше?..

Очерствели они там все, что ли?..

Марина КОКТЫШ.

КОММЕНТАРИЙ

Галина ЧИГРИНОВА, председатель Республиканского комитета Белорусской общественной организации солдатских матерей:

«Взяли в армию здорового — здорового и верните!»

Галина Чигринова прекрасно понимает ту боль и эмоции, которые сейчас испытывает мать Александра Габруковича, — много лет назад она сама потеряла сына.

— История с Александром — самая страшная за последние годы, — *вздыхает Галина Николаевна.* — Не так давно был случай, когда во время испытаний на краповый берет парень получил очень серьезную травму, долго лежал в госпитале, но он выздоровел и теперь служит в войсках МВД. Ни его родители, ни он сам никаких претензий тогда не предъявляли, потому что парень хотел получить право носить этот берет и принял решение пройти испытание. Но его травма, конечно, несравнима с той, что получил этот мальчишка...

Знаю, что парень, который его избил, теперь под следствием. Скорее всего его посадят, но матери и пострадавшему от этого, конечно, не легче. Я все это понимаю, потому что сама похоронила сына...

Галина Николаевна отмечает, что организация солдатских матерей не оказывает материальную помощь — только моральную. И настоятельно рекомендует Александру Габруковичу и его матери обратиться к командиру воинской части и к министру обороны.

— Это неординарный и очень тяжелый случай, — *говорит она.* — И если воинская часть откажет в помощи, то министр обороны, думаю, должен помочь. Я тоже поддержу это обращение.

На ремарку о том, что армейские начальники и сами могли бы проявить инициативу и сердечность, Галина Николаевна отвечает так:

— К сожалению, не все командиры такие... Понятно, что в случае Александра нужны большие расходы — и на лекарства, и на восстановление... У армии есть средства, и если надо, то они помогают. Был случай, когда у солдата в результате взрыва газового баллона были обожжены руки и лицо, он был изуродован и нуждался в пластической операции, а никто не хотел помогать материально. К нам за помощью обратилась его мать, вместе мы добились, чтобы парня прооперировали. Нужно стучаться во все двери.

Галина Чигринова говорит, что сейчас в армии смертельные случаи — редкость. А вот травм, в том числе и серьезных, действительно много.

— В девяностые годы в армии творилось что-то кошмарное, — *рассказывает она.* — Ежегодно умирало до 100 человек! В начале 2000-х вышли уже на меньшие цифры. Была проделана огромная работа, мы ездили по воинским частям, выступали по радио и телевидению. К счастью, сейчас смертельные случаи — уже редкость. Но травматизм в армии есть, и об этом нужно говорить. Травмы случаются и по вине самих солдат, которые не соблюдают технику безопасности, и по вине командования. К нам очень много обращается матерей по поводу травм. Некоторым пострадавшим дают группу, а некоторым — нет. Комиссуют — и все на этом! А дальше матери что делать, если сын и работать не может, и жить дальше не знает как? И материальной поддержки нет.

Я вообще считаю, что инвалида армии нужно приравнять к инвалиду Великой Отечественной войны. Мать вырастила и отправила сына в армию здоровым, он прошел медкомиссию, а ей вернули покалеченного! И она должна его содержать! Разве это справедливо? Взяли в армию здорового — здорового и верните! А если уж случилась беда, как с этим парнем, значит, нужно обеспечить ему материальное содержание и помогать всю жизнь! Это очень важный вопрос!

На мой взгляд, в армию нужно призывать не в 18, а в 20 лет, и сделать только год службы. А 18-летним парням, с моей точки зрения, еще слишком рано и опасно доверять оружие...

Знаю случаи, когда солдат, получивших травмы, выбрасывают просто на улицу, не назначая ни пенсии, ни пособия, ничего! Я считаю, что Министерство обороны должно найти средства на пострадавших защитников страны! И обязано обеспечить им достойную жизнь — ведь они на родину работали...

ЧУЛІ?

Беларусы зноў купляюць новыя аўто

Продажы новых легкавых аўтамабіляў (без уліку расійскіх марак) выраслі ў Беларусі амаль у два разы.

Пра гэта заявіў генеральны дырэктар “Атлант-М” у Беларусі **Сяргей Самойла.** Па даных кампаніі, продажы за першы квартал 2013 года выраслі на 90% у параўнанні з аналагічным перыядам 2012 года.

У “Атлант-М” падобнае ажыўленне тлумачаць паступовым зніжэннем працэнтных ставак на аўтакрэдыты, пераходам свабодных рэсурсаў на аўтамабільны рынак, а таксама адкладзеным попытам, які сфарміраваўся ў Беларусі ў мінулым годзе. Акрамя таго, свой уклад унесла і пашырэнне прапановы іншамарак, якія збіраюцца ў Расіі.

“Мы прагназуем устойлівы рост рынку ў 2013—2015 гадах”, — заявіў Сяргей Самойла. Паводле яго слоў, аднаўляецца і пацярпелы больш за ўсіх прэміум-сегмент, што ўжо відаць па першых выніках 2013 года.

Пры гэтым, згодна са статыстыкай, імпарт аўтамабіляў пакуль адстае ад продажу. Паводле звестак Белстата, увоз аўтамабіляў у першым квартале 2013-га вырас у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ўсяго на 62,2% (або зусім на 54,7%, калі выключыць чыста расійскія маркі ВАЗ, ГАЗ, УАЗ і іншыя).

У Чэрыкаўскім раёне ствараюць музей рачных якараў

Першы ў Беларусі музей рачных якараў пад адкрытым небам у вёсцы Мірагошч Чэрыкаўскага раёна з’явіцца дзякуючы гаспадару аграсядзібы “Лілея” Сяргею Дубягу.

Неяк купаючыся ў Сожы, ён наступіў на нешта цвёрдае, а калі зразумеў, што гэта якар, падняў са дна. Так і пайшло. Даведаўшыся, што Дубяга пачаў збіраць якары, сябры, калегі і нават незнаёмыя людзі сталі аддаваць яму свае. Жыхары Чэрыкаўшчыны іх таксама ў рацэ знаходзілі. У час адпачынкаў калекцыянер адпраўляўся ў экспедыцыі ў вярхоўі Сожа спецыяльна за якарамі. Некалькімі экспанатамі ён разжыўся ў жыхароў Клімавіцкага раёна. Зараз у яго калекцыі 27 якараў, якія датуюцца рознымі стагоддзямі.

Ля музея будзе пабудавана міні-гасцініца ў выглядзе вялікага карабля, і разбіта зона адпачынку прама на беразе Сожа. Ужо зроблены праект і пачаты падрыхтоўчыя работы. Па словах Сяргея, прымаць турыстаў ён плануе ўжо ў наступным годзе. Больш за тое, сядзіба Дубягі і яго музей якароў уключаны ў зялёны маршрут “Жывая вада”, які створаны ў турыстычным кластары “Край жыватворных крыніц”.

У тым, што сюды будуць ехаць турысты, Сяргей Мікалаевіч не сумняваецца, бо вёска Мірагошч мае багатую гісторыю. На ўскраіне вёскі ў лукавіне Сожа знаходзіцца геалагічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння — міжледніковае агаленне, а ў суседняй вёсцы Горкі — святая крыніца. *“Тут найпрыгажэйшыя месцы, цудоўныя пейзажы, недалёка пойменныя дубровы, у рацэ водзіцца шмат рыбы, а ў лясах шмат ягад і грыбоў, так што адпачывальнікаў будзе чым заняць”,* — цытуе belta.by гаспадара аграсядзібы.

Духі смерці дапамаглі зарабіць 50 долараў

Першая гульня для платформ iPhone Android, пабудаваная на падмурку беларускіх міфаў і легендаў, распаўсюджваецца па свеце.

Распрацоўшчыкі гульні Navii не чакалі, што твор прынясе ім славу і мільёны долараў. Для стваральнікаў куды важней было запусціць у прасторы Сеціва першы ў свеце гульнявы праект, які б базіраваўся на старадаўніх беларускіх міфах і легендах. Пасля доўгай працы некалькі месяцаў таму гульня Navii была запушчана.

Зрэшты, атрымалася якраз так, як і думалі распрацоўшчыкі. Пакуль два сябры — праграміст Сяргей і мастак Міхаіл — зарабілі на продажах свайго прадукту каля 50 долараў, што назваць прыбыткам можна з вялікай нацяжкай. Пры гэтым гульню спампавала ўжо некалькі тысяч чалавек, якіх зацікавіла беларуская міфалогія.

Назва праекта дае прадстаўленне аб сэнсе гульні — навіі ў беларускай міфалогіі былі духамі смерці. Магчыма, у будучым гісторыя атрымае развіццё, але пакуль распрацоўка спынілася, бо адзін з сааўтараў праекта сышоў у войска...

Сяргей ШЭЛЕСТ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
21 ЧЭРВЕНЯ 2013 г.

ПУЛЬС ПЛАНЕТЫ

Обама: власть не в руках военных и не в руках правительств. Она — в руках граждан

Барак Обама стал первым американским президентом, выступившим с обращением к жителям Берлина с восточной стороны Бранденбургских ворот. В начале своей речи он вспомнил об участниках Берлинского восстания 1953 года:

“Сегодня, через 60 лет после того, как они восстали против угнетения, мы помним о восточных немцах — героях 17 июня, когда стена окончательно пала и мечты стали реальностью благодаря их силе и страсти. Их мужественный пример напоминает нам о том, что власть не в руках военных и не в руках правительств. Она — в руках граждан. И им решать: быть стене или разрушить ее”.

В Болгарии недовольны политикой властей

Манифестанты, недовольные политикой властей, призывают к отставке кабинет во главе с Пламеном Орешарски.

Протесты начались в минувшую пятницу. Поводом к ним послужило назначение главой государственной службы национальной безопасности Деляна Пеевски — медиамагната, депутата от партии, представляющей турецкое этническое меньшинство. Парламент проголосовал за отмену этого решения. Но акции в крупнейших городах страны продолжаются.

Сам Пеевски отказался от поста, а премьер Орешарски извинился за неправильное кадровое решение. Но демонстрантов, похоже, уже не остановить. Манифестации проходят не только в Софии, но также в Пловдиве и Варне. Участники акций требуют от правительства беспощадной борьбы с бедностью и коррупцией.

В Египте не прекращаются столкновения исламистов и оппозиции

Наиболее ожесточенные стычки произошли в городе Дисук, расположенном к северо-востоку от Каира в провинции Кафр-эш-Шейх.

Все началось с того, что оппозиционные активисты окружили здание, где должна была пройти конференция “Братьев-мусульман” в поддержку президента страны Мухаммеда Мурси. Они забросали место встречи исламистов камнями и бутылками с зажигательной смесью, после чего беспорядки быстро охватили все близлежащие улицы. С обеих сторон активно применялись “коктейли Молотова”, дубинки, ножи и арматура. Временами звучали выстрелы. Пострадали десятки человек, которых местные жители развозили по больницам на машинах и мотоциклах.

В городе Итса в окрестностях Фаюма (в ста километрах к юго-западу от столицы) на одной из улиц сошлись два марша — в поддержку и против главы государства. Началась потасовка, ИТАР-ТАСС сообщает о 30 пострадавших.

Неспокойной остается обстановка и в тех провинциях страны, где указом Мурси губернаторами были назначены представители “братьев”. В Дакахлии, Минуфии и Гарбии прошли столкновения.

Вице-спикер британского парламента арестован за домогательства

55-летнего политика арестовали во время допроса в полицейском участке города Пендлтон в графстве Ланкашир на западе Англии. Еще в мае политик был задержан по обвинению в изнасиловании и сексуальных домогательствах к двум молодым людям. Его отпустили под залог. Теперь ему предъявлены новые обвинения.

О своей нетрадиционной сексуальной ориентации Найджел Эванс объявил еще в 2010 году и с тех пор стал активным защитником прав сексуальных меньшинств. Депутатом парламента он является с 1992 года.

Наказали эстрадных артистов за «бессмысленность песен»

Совет по развитию эстрадного искусства при Эстрадно-концертном объединении “Узбекнаво”, являющийся государственным лицензирующим органом в Узбекистане, наказал местных эстрадных артистов за “бессмысленность песен” и утрату “требовательности к себе”. Об этом сообщает “Фергана” со ссылкой на официальный сайт “Узбекнаво”.

По мнению чиновников, репертуар таких исполнителей, выступающих в основном на свадьбах и других семейных торжествах, составляют бессмысленные произведения, лишенные художественной ценности и не отвечающие “высоким требованиям исполнительского искусства”. “Их песни не соответствуют нашим национальным духовным традициям, они противоречат нашему нравственному наследию и менталитету. Мы не должны забывать о своем долге воспевать нашу Родину, наш народ и его счастье”, — отмечается на сайте “Узбекнаво”.

В Узбекистане эстрадная музыка давно взята под государственный контроль. В частности, “Узбекнаво” еще в 2006 году начало контролировать и фильтровать тексты песен, которые исполняют местные артисты.

В Латвии ужесточили запрет на советскую символику

Сейм Латвии принял в третьем, окончательном, чтении законопроект, ужесточающий запрет на использование советской и нацистской символики. Об этом сообщает Mixnews.

В соответствии с законопроектом действующий запрет, касающийся использования символики СССР и нацистской Германии в определенных ситуациях, распространится также на памятные, праздничные и развлекательные мероприятия. В перечень запрещенной символики попали флаг, герб и гимн СССР (а также соответствующие символы Латвийской ССР) и нацистской Германии, советские серп, молот и пятиконечная звезда, нацистская свастика.

Документ предусматривает исключения. Как утверждается, использование указанной символики возможно, если это не связано “с прославлением тоталитарных режимов или оправданием их преступлений”.

ФОТООКНО



Никакие заявления участников саммита не могли сказать о его итогах больше, чем лица Барака Обамы и Владимира Путина на пресс-конференции по итогам личной встречи. Американский президент с отсутствующим видом разглядывал собственные ботинки, а его российский коллега, покусывая губы, глядел в потолок и по сторонам. Суть сделанных ими заявлений была такова: компромисса нет, все остаются на прежних позициях.

А позиции эти соответственно таковы: США настаивают на уходе Башара Асада и создании переходного правительства, Россия об отставке Асада слышать ничего не желает, заявляя, что он должен быть частью политического решения.

Таков комментарий итогов саммита Большой восьмерки на сайте Lenta.ru.

ЛИЧНАЯ ЖИЗНЬ

Страшная тайна нового президента Ирана

